ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 57 (1326) | АЎТОРАК, 10-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.


На працэсе ў Маскоўскай калённай залі

ПРЫГАВОР МІЛЬЕНАЎ

„Вінаваты“—казалі ўсе 14 меншавікоў на судзе. Яны прызналі сябе вінаватымі ў падрыхтоўцы ўзброенай інтарвэнцыі супроць краіны саветаў, у падрыхтоўцы да нізвяргненьня дыктатуры пролетарыяту.

Сьметным і нікчэмным элемэнтам раскайваньня былі запоўнены падсуднымі паказаньні пролетарскаму суду. Прызнаньне суду з боку падсудных,—меншавікоў, дывэрсантаў, інтэрвэнтаў і раскаяньне ў сваёй праводзімай ганебнай і агіднейшай дзейнасьці супроць краіны пролетарыяту, дакладна выкрывае здрадніцкую ролю другога Інтэрнацыянала, выкрывае дзейнасьць зграі прыслужных сабак сусьветнай буржуазіі—Данаў, Абрамовічаў, Вандэрвэльдэ.

Спадзяючыся на капіталістычнае перарастаньне нашай гаспадаркі, меншавікі ўсё больш і больш скачваючыся па нахіленай здрады ў сваёй пляцформе яшчэ ў 1924 годзе патрабавалі: „шырокая дэнацыяналізацыя прамысловасьці і гандлю“. „Пераход за невялікім выключэньнем прамысловасьці ў рукі асобных прадпрыемцаў“—гэта значыць зварот фабрык і заводаў былым уладарам: „Прадстаўленьне асобным уласьнікам права свабоднага распараджэньня знаходзячыхся ў іх уладаньні зямель“, „Ліквідацыя саўгасаў“; „ліквідацыя цэнтралізаваных дзяржаўных гандлёвых апаратаў, свабода ўнутранога часовага гандлю. У замежным гандлі—замена монополіі ўнешняга гандлю дзяржаўным рэгуляваньнем сыстэмы мытніцкіх пошлін“.

Адпак, пераканаўшыся ў краху сваіх надзей, бачачы шпаркі рост нашага соцыялістычнага будаўніцтва, меншавікі перайшлі да тактыкі шкодніцтва, дывэрсыі і ў саюзе з контррэволюцыйнымі партыямі („Горгпромам“, Кандрацьцевым, „Прампартыяй“) атрымаўшы натхненьне і матэр'яльную дапамагу ад другога Інтэрнацыянала і нямецкага соцфашызму, кіруючыся дырэктывамі так званай „замежнай дэлегацыі“ рыхтавалі ўзброенны напад на СССР.

Працоўным і прыгнечаным усяго сьвету дорага здабываемае ў цяжкасьцях, слаўнае пераможнае соцыялістычнае будаўніцтва. І колькі-б ня енчылі соцыял-дэмократы-меншавікі, колькі-б не распаўсюджвалі хлусьні пра СССР, ганебную пляму здрады справе пролетарыяту ім з сябе ня змыць. Рабочая кляса СССР адказвае на ўсе гэтыя спробы меншавікоў—падзідышаў буржуазіі—ўзмацненьнем абароназдольнасьці краіны новай хваляй творчага ўздыму, організацыяй новых брыгад, ударніцтва, ліквідацыяй прарываў, масавым паходам за аўладаньне тэхнікай, яшчэ большым згуртаваньнем вакол комуністычнай партыі, перадачай ў шэрагі партыі лепшых сыноў рабочае клясы—ўдарнікаў.

Колгасьнікі і бядняцка-серадняцкія масы ў сваю чаргу адказваюць пасіленьнем тэмпаў падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны, новай хваляй колгаснага прыліву. Працоўныя мобілізуюць усе сілы на пасьпяховае завяршэньне пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі. Гэты адказ мільёнаў ёсьць лепшы прыгавор ня толькі над 14-ю меншавікамі, але і над другім Інтэрнацыяналам, над сусьветнай буржуазіяй.

Прысуд над контррэволюцыйнай організацыяй меншавікоў-інтэрвэнтаў*)

Спэцыяльная прысутнасьць Вярхоўнага Суду знаходзілася ў нарадчым пакоі ад 15 г. 29 хв. 8-га сакавіка да 16 г. 45 хв. 9-га сакавіка. У 16 г, 45 хв. 9-га сакавіка адкрылася пасяджэньне спэцыяльнай прысутнасьці Вярхоўнага Суду СССР у складзе старшыні тав. Шверніка і членаў прысутнасьці т. т. Антонава-Саратаўскага і Муранава.

Тав. Швэрнік зачытаў уматываваны прыгавор па справе контр-рэволюцыйнай арганізацыі меншавікоў.

Спэцыяльная судовая прысутнасьць Вярхоўнага Суду СССР, разгледзеўшы на адкрытым судовым пасяджэньні з 1-га па 9-га сакавіка 1931 г. справу контр-рэволюцыйнай арганізацыі „Саюзнае бюро“ ЦК РСДРП (меншавікоў) прыгаварыла:

***Тэйтэльбаума, Рубіна і Воўкава** да 5 год пазбаўленьня свабоды з паражэньнем у правох на 2 гады кожнага.*

***Сакалоўскага, Залкінда, Берлацкага і Ікава**—да 8 год пазбаўленьня свабоды з паражэньнем у правох тэрмінам на 3 гады кожнага.*

***Пятуніна, Фін-Енатаеўскага, Якубовіча, Гінзбурга, Суханава, Шэра і Громана**—да 10 год пазбаўленьня свабоды з паражэньнем у правох на 5 год кожнага.*

Прыгавор канчатковы, абскарджэньню не падлягае.

Чытаньне прыгавору працягвалася каля гадзіны.

Прыгавор быў сустрэчан перапоўненай заляй аплёдысмэнтамі.

Пасяджэньне закрылася ў 17 гадз. 50 хв.

*) Прыгавор даецца ў скарочаным выглядзе.

Раніцтвае пасяджэньне 7 сакавіка

„Мы былі тымі, хто служыць інтарэсам буржуазіі“

— Абараняць мяне няма чаго,—кажа Громан,—бо я прызнаў сваю віну і на працягу судовага процэсу імкнуўся выкрыць усё тое, што мне вядома аб контррэволюцыйнай дзейнасьці меншавіцкай організацыі і ІІ-га Інтэрнацыянала.

Громан расказвае гісторыю меншавізму, яго барацьбу з бальшавізмам і тое, як меншавізм паступова скаціўся ў балота контррэволюцыі.

— Я ўсьвядоміў усю глыбіню злачынстваў супроць рабочай клясы, усьвядоміў усю глыбіню маіх „заблуждений“. Зразумеў крыніцу маіх злачынстваў. Гэта сьвядомасьць прывяла мяне да неабходнасьці разэброіцца, да неабходнасьці сказаць, што мы зьяўляёмся прадстаўнікамі тэй плыні, якая страціла права на існаваньне. Мы былі тымі хто служыць інтарэсам і мэтам буржуазіі. Для савецкай улады гэта ўжо ясна, як дзень. Мне трэба загладзіць хаця-б у малой меры тыя вялізарныя цяжкія злачынствы, якія я, як кіраўнік контррэволюцыйнай шкодніцкай організацыі, зрабіў, падрыхтоўваючы інтэрвэнцыю, ст[в]арыўшы блёк з контррэволюцыйнымі партыямі.

„Гістарычная місія соцыял-дэмократыі—умацаваньне дыктатуры капіталу“

Суханаў падрабязна выкладае свае погляды на расійскі і міжнародны меншавізм. Суханаў гаворыць:

Сучасны меншавізм—гэта фундамант буржуазна-капіталістычнага грамадзтва.

— Міжнародная соцыял-дэмократыя —гэта апарат для пранікненьня ідэй буржуазнай дзяржавы ў рабочыя масы. Без соцыял-дэмократыі зараз у краінах капіталу кіраваць нельга. Суханаў гаворыць, што ён цяпер выразна разумее, што гістарычная місія соцыял-дэмократыі—гэта ўмацаваньне дыктатуры капіталу. Пераходзячы да ацэнкі пляцформы рускіх меншавікоў, прынятай у 1924 годзе, якая дзейнічае і да гэтага часу, Суханаў канстатуе, што ў гэтай програме меншавікі ставяць сваёй мэтай пасьля зьвяржэньня савецкай улады, зварот капіталістым фабрык і заводаў, памешчыкам—зямлі. У руках-жа дзяржавы заставалася-б тое, што было пры царскім ладзе.

Падрабязна расказваючы аб усіх сваіх „хістаньнях“ ад падтрыманьні адкрытай контррэволюцыі да лібэральных адносін да савецкай улады, Суханаў гаворыць, што „ў 1928 годзе ён быў гатоў уступіць у саюз з меншавікамі, эсэрамі і кулакамі і самім чортам толькі б скінуць савецкую ўладу“.

Таму ён прыняў прапанову Громана, увайшоў у контррэволюцыйную шкодніцкую організацыю меншавікоў. Гэта было. На гэтым ён канчае сваю прамову. Ён спадзяецца растлумачыць суду сутнасьць сваёй памылкі ў апошнім слове.

Абвяшчаецца перапынак да вечара.

Вячэрняе пасяджэньне 7-га сакавіка

На вячэрнім паседжаньні 7 сакавіка працягваліся спрэчкі бакоў. З абарончымі прамовамі выступілі падсудныя: Шэр, Гінзбург, Якубовіч, Залкінд, Рубін.

„Мае контр-рэволюцыйныя злачынствы—злачынствы ІІ-га Інтэрнацыянала“

Падсудны Шэр гаворыць аб сваім політычным шляху, як шляху меншавізму, як аб здрадзе інтарэсам рабочае клясы. Контр-рэволюцыйныя злачынствы, якія зрабіў я,—гэта злачынствы ўсяго ІІ-га Інтэрнацыянала. Кожны меншавік павінен ведаць, што ўся барацьба, якую мы вялі супроць савецкай улады, зводзіцца да контр-рэволюцыйнай работы супроць дыктатуры пролетарыяту. Кожны меншавік—вораг рабочай клясы, вораг соцыялістычнага будаўніцтва. Меншавізмператварыўся ў контр-рэволюцыйную партыю.

У заключэньне падсудны Шэр просіць Вярхоўны суд даць яму магчымасьць правесьці рэшту жыцьця ў барацьбе за соцыялістычнае будаўніцтва.

„Мы ўзьнялі рукі на лад пролетарскай дыктатуры“

Мы ўзьнялі рукі на лад пролетарскай дыктатры, мы прабавалі сарваць соцыялістычнае будаўніцтва,—гаворыць падсудны Гінзбург. Апрача нас ёсьць яшчэ элемэнты, якія і зараз яшчэ ня спыняюць шкодніцкай справы. Гэту політыку настойліва праводзіць 2-гі Інтэрнацыянал. Пролетарыят усяго сьвету ня можа і не павінен ні ў найменшай меры з ставацца пасыўным перад тварам гэтай здрадніцкай політыкі. Рабочыя капіталістычных краін павінны зразумець, што 2-гі Інтэрнацыянал падтрымлівае фінансавую блёкаду, вядзе шалёную пропаганду супроць Савецкага Саюзу, рыхтуе інтэрвэнцыю супроць краіны Саветаў.

Я поўнасьцю прызнаю свае злачынствы перад рабочай клясай. Я зразумеў усю тую вялізарную шкоду, якую контррэволюцыйная меншавіцкая організацыя прынесла рэволюцыйнаму рабочаму руху.

Падсудны просіць даць яму магчымасьць рэшту жыцьця аддаць справе рэволюцыі.

Прамова падсуднага Якубовіча

Падсудны Якубовіч у сваёй прамове падрабязна спыняецца на тых пунктах і матывах пад уплывам якіх ён стаў на шлях здрады рабочай клясе.

Мы ніколі-б самі не адважыліся на тактыку шкодніцтва, калі-б у нас ня было кіруючых указаньняў заграніцнага меншавіцкага цэнтру. Мы-ж, меншавікі ніколі рашучасьці ў сваіх дзеяньнях не выяўлялі. Але заграніцная дэлегацыя, даваўшая нам ясную катэгорычную дырэктыву наконт шкодніцтва, і сама на свой страх не адважылася-б на падобныя дзеяньні, калі-б ня мела наконт гэтага ўхвалу з боку 2-га Інтэрнацыянала.

У заключэньне, падсудны заяўляе, што ён разбройваецца перад савецкай уладай і раскайваецца ва ўсіх сваіх злачынствах перад рабочай клясай.

Прамова падсуднага Залкінда

Падсудны Залкінд пачынае сваю заключную прамову з указаньня, што яму больш цяжка, чым большасьці падсудных, гаварыць аб сабе, бо сваю політычную дзейнасьць ён распачаў у радох бальшавіцкай партыі.

Прамова падсуднага Рубіна

—Я хачу,—кажа падсудны Рубін,—разброіцца поўнасьцю ня толькі ў сэнсе адрачэньня, ад сваей мінулай політычнай дзейнасьці, але і разброіцца ідэёва. Я прышоў да найглыбейшага і цьвёрдага пераканаьня, што меншавіцкая ідэолёгія, якая адмяўляе соцыялістычны характар Кастрычніцкай рэволюцыі, савецкае будаўніцтва, зьяўляецца да мазга касьцей хлусьлівай і шкодніцкай.

Раніцтвае пасяджэньне 8-га сакавіка

Прамова падсуднага Сакалоўскага

Пасяджэньне аднаўляецца абарончай прамовай Сакалоўскага. Надзеі меншавікоў на катастрофу бальшавізму з разгорнутым соцыялістычным наступленьнем разбурыліся. Ад выкананьня дырэктыў заграніцнага меншавіцкага цэнтру, пры падтрыманьні ІІ-га інтэрнацыяналу, меншавіцкая організацыя перайшла да шкодніцкай дзейнасьці, да блёку з контр-рэволюцыйнымі партыямі, да стаўкі на інтэрвэнцыю. „Мы спадзяваліся,—кажа падсудны Сакалоўскі,—на тое, што ІІ Інтэрнацыянал зможа апрацаваць рабочыя масы і выклікаць у іх пасыўныя адносіны да інтэрвэнцыі супроць краіны Саветаў. Але гэта не ўдалося. Рабочыя масы ўнутры СССР усё-ж за намі не пайшлі, нават паасобных рабочых мы не змаглі завербаваць у сваю організацыю. Патаемна мы падтрымлівалі інтэрвенцыю, але адкрыта мы павінны былі стаяць на соцыялістычнай пляцформе“.

Падсудны прызнае ўсе свае злачынствы перад рабочай клясай.

Прамова падсуднага Ікава

Падсудны Ікаў у сваёй абарончай прамове гаворыць аб цясьнейшай сувязі паміж контр-рэволюцыйнай работай „Саюзнага бюро“ і заграніцным меншавіцкім цэнтрам. Лінія ІІ Інтэрнацыянала—гэта лінія на зьвяржэньне савецкай улады. Меншавікі разьбіты ўшчэнт, і я назаўсёды спыняю барацьбу супроць савецкай улады, бо я прайшоў увесь шлях да канца разам з партыяй і зайшоў у тупік. Дарога ў рабочыя масы для меншавіцкай партыі закрыта назаўсёды. Здрадніцкая работа меншавікоў не сустракае ні найменшага падтрыманьня ў рабочых масах. Падсудны просіць суд даць яму магчымасьць скарыстаць свае веды на справу соцыялістычнага будаўніцтва.

Прамова падсуднага Пятуніна

„Мы аказаліся—гаворыць ён,—па той бок барыкад, у лягеры ворагаў пролетарыяту, абярнуліся ў здраднікаў рабочае клясы. Контр-рэволюцыйная меншавіцкая організацыя змагалася за ўстанаўленьне капіталізму ў краіне саветаў. У гэтым ёй актыўна дапамагалі як кіраўніцтвам, так і сродкамі заграніцны меншавіцкі цэнтр і 2-гі Інтэрнацыянал.

Абарончая прамова падсуднага Бэрлацкага

Падсудны Бэрлацкі кажа, што ён прайшоў усю меншавіцкую школу, у ёй ён выхаваўся ў духу няверʼя ўва сілы рабочай клясы, нявер'я ў магчымасьць перамогі рабочай клясы, нявер'я ў творчыя магчымасьці рабочае клясы. Ён лічыў, што ў адсталай Расіі немагчыма перамога пролетарскай рэволюцыі. Кастрычніцкую рэволюцыю, ён лічыў асуджанай на пагібель, ня верыў у яе перамогу. Толькі цяпер ён зразумеў усю глыбіню яго здрадніцтва інтарэсам рабочае клясы, „Я зразумеў,—кажа Бэрлацкі,—што адзіна правільная лінія ў інтарэсах рабочае клясы—гэта лінія савецкай улады. Сапраўдная бацькаўшчына рабочае клясы ўсяго сьвету—Савецкая краіна. Я шчыра і сумленна кажу, што Савецкая краіна—краіна, якая будуе соцыялізм“.

Далей суд пераходзіць да заслухоўваньня апошняга слова падсудных.

Суханаў

Першы гаворыць Суханаў. Ён гаворыць, што жыцьцё і факты прывялі яго да пераканаьня, ён цяпер цьвёрда пераконан, што пролетарская дыктатура прызвана ажыцьцявіць вялікія гістарычныя задачы. „Я веру, што УсеКП(б) сваім мэтодам, сваёй організацыяй, сваёй політыкай перамагла“.

Воўкаў

„У царскія часы,—гаворыць падсудны,—нам лёгка было ісьці на катаргу і ў ссылку, бо мы не адчувалі ні ценю раскаяньня ў зробленых намі рэволюцыйных справах. Ня тое цяпер... мая просьба да суда—зьмякчыць лёс маіх таварышоў і мой асабіста і даць нам усім магчымасьць актыўна браць удзел у соцыялістычным будаўніцтве, якое разгортваецца“.

Громан

Падсудны Громан яшчэ раз гаворыць аб сваім поўным і шчырым разэбраеньні і ў заключэньне заяўляе: „няхай суд вырашыць ці можна пры ўсім тым, што ён ведае аба мне, ацаніўшы таксама мае паводзіны у часе судовага сьледзтва, верыць гэтай маёй заяве і даць мне магчымасьць жыць весьці работу на карысьць Савецкага Саюзу“.

Гінзбург

Калі суд знойдзе магчымым захаваць мне жыцьцё, то я абяцаю аддаць яго цалкам соцыялістычнаму будаўніцтву.

Падсудныя Тэйтэльбаўм, Фін-Енатаеўскі, Бэрлацкі, Сакалоўскі, Рубін і Якубовіч у сваіх апошніх словах выказваюцца ў такім-жа духу, як і папярэднія падсудныя.

Падсудныя Ікаў, Шэр і Пятунін ад апошняга слова адмовіліся.

У 3 гадз. 20 хвіл. суд пераходзіць у нараду.

Сёньня—першая канфэрэнцыя маладых ударнікаў Менаддзяленьня Прамкоопрацы

У НОГУ З СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫЯЙ

Маладыя ўдарнікі прамкоопэрацыі, узброівайцеся навукай і тэхнікай, станавіцеся ў першыя шэрагі барацьбітоў за соцыялістычнае будаўніцтва

ПРАМКООПЭРАЦЫЯ Ў 3-М РАШАЮЧЫМ

Прамысловая коопэрацыя ва ўсёй сыстэме народнай гаспадаркі займае вялікае месца. Пастановай партыйных і савецкіх органаў на прамысловую коопэрацыю як дадатак да дзяржпрамысловасьці, ускладзены сур'ёзнейшыя абавязкі ў сэнсе здавальненьня шырокіх працоўных мас продукцыяй шырокага спажываньня, выпуска продукцыі для здавальненьня патрэб соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

У сваёй пастанове ад 22-XII-1930 г. СНК СССР канстатуе, што разгортваньне вытворчасьці Праамкаапэрацыі яшчэ не адпавядае ўзрослым патрабаваньням народнай гаспадаркі СССР. Гэтай-жа пастановай вызначаны конкрэтныя мерапрыемствы па перабудове работы прамкоопэрацыі.

У сьвятле гэтых задач, выходзячы з ажыцьцяўленьня пастаноў XVI-га парт. зьезду перабудоўваецца і разгортваецца работа прамкоопэрацыі Менскага Райпрамсаюзу. Гэта відаць з таго, што ў 1920-30 г. выпушчана продукцыі на 9.014.000 руб. ва ўдарны квартал—4.158.000 руб., у 1931 г.—вызначана выпусьціць продукцыі паводле прамфінпляну на 20.400.000 руб.

Гэтыя вялізарнейшыя задачы якія стаяць перад сыстэмай Менскага Саюзу, як па павялічэньню выпуска продукцыі на 100 пр., так і пераключэньню работы на мясцовай сыравіне, і па зьніжэньню ўдзельнай вагі дэфіцытных прамыслоў з 72 проц. у 1929-30 г. да 35 проц. у 1931 г., бязумоўна патрабуюць мобілізацыі ўсёй арцельнай грамадзкасьці, у першую чаргу мобілізацыі партыйцаў і комсамольцаў, шляхам разгортваньня соцыялістычных мэтадаў працы соц.спаборніцтва і ўдарніцтва.

Моладзь у прамкоопэрацыі складае 864 ч. альбо 23 проц. Соц.-спаборніцтвам ахоплена 61 проц. усёй моладзі, ударных брыгад з моладзі 20, вытворчых комун з 10.

Па кантрольных лічбах на 1931 г. вызначана давесьці лік моладзі да 30 проц. агульнага ліку членаў арцеляй.

Пастаўленыя задачы партыяй і ўрадам ў галіна разьвіцьця вытворчай дзейнасьці Прамкоопэрацыі, выпрацоўка продукцыі па Менскаму Саюзу на суму 20.400.000 руб. высоўвае пытаньне перад моладзьдзю аб больш рашучым павароце тварам да выкананьня практычных задач вытворчасьці. Комсамольскі колектыў разам з беспартыйнай моладзьдзю Менрайпрамсаюзу павінен адыграць выключную ролю, узяўшы на сябе ініцыятыву ў організацыі соцыялістычных мэтадаў працы.

Комсамольскі колектыў павінен павесьці яшчэ большую барацьбу за якасьць продукцыі, разгарнуць рашучую барацьбу са стратамі ў вытворчасьці, сачыць за правільным скарыстаньнем сыравіны і ўсіх адходаў.

Неабходна давесьці контрольные лічбы па коопэраваньню моладзі ў арцелях на 1931 год да цэхоў і кожнага члена арцелі. Ліквідаваць прарыў па мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў (100 проц, вярбоўкі ўкладчыкаў ў Ашчадкасы).

Шырэй разгарнуць політыка-выхаваўчую працу сярод моладзі. Комсамольскім ячэйкам неабходна шырэй разгарнуць працу па інтэрнацыянальнаму выхаваньню, праводзячы конкрэтныя мэтады па ажыцьцяўленьню рашэньняў XVI-га зьезду УсеКП(б) і XIII-га зьезду КП(б)Б у галіне ленінскай нацыянальнай політыкі партыі.

Шэвельман, Шульц.

На баявых позыцыях

Комсамольскі колектыў раней складаўся з пяці цэх. ячэек прычым кожная з іх аб'яднала па 6—7 арцеляў рознага роду вытворчасьці, ў выніку гэтага ячэйкі нябылі здольны правільна організаваць працы на вытворчасьці.

На сёньнешні дзень адчуваецца значны пералом у гэтай галіне. Зараз-жа пасьля рэарганізацыі партыйнага колектыву па выбарчаму прынцыпу, комсамольскі колектыў таксама рэорганізаваўся. Былі створаны 6 цехавых ячэек: швейнікаў, абутнікаў, трыкатажнікаў і інш.

На першых організацыйных сходах мы ўжо мелі колектыўныя заявы ад лепшых ударнікаў аб уступленьні ў шэрагі ЛКСМБ. Комсамольскі колектыў вырас з 102 чал. да 175 чал.

Соц. спаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплены ўвесь колектыў і большасьць б-партыйнай моладзі.

На гэтым спыніцца нельга, мы павінны зараз пераключыць ўсю працу яч. ЛКСМБ так каб забясьпечыць сапраўды масавы ўдзел рабочай моладзі ў жыцьці працы арцеляй.

Замацаваць працу месячніку паходу за якасьць, які быў абвешчаны комсамольскім колектывам, ні воднага проценту браку, ніводнага проценту страт у вытворчасьці,—такі лёзунг сёньнешняга дню.

Ячэйкі ўключыліся, у паход за тэхніку але гэта мала. Увесь колектыў павінен быць уключан у паход за тэхніку, з прыцягненьнем шырокай масы б-партыйнай моладзі, шляхам організацыі пляна ва апэрацыйных груп, гурткоў па вывучэньню тэхнікі вытворчасьці і г. д.

Зараз мы ўступілі ў рашаючы месяц першага кварталу. У гэты месяц мы павінны прылажыць максімум энэргіі, каб ліквідаваць прарыў які быў ў студзені і лютым месяцах і перавыканаць прамфінплян за першы квартал.

Зарэцкі.

Перабудоўваем сваю працу

Некаторы час таму назад вучнёўская брыгада арцелі „Пролетары“ ў колькасьці 84 чал. працавала бяз усякіх мэханізаваных машын, з-за гэтага ўтварыўся прарыў у рабоце. Соц. спаборніцтва і ўдарніцтва ня было разгорнута.

Бюро комсамольскай ячэйкі паставіла пытаньне аб перабудове ўсёй работы вучнёўскай брыгады. Дзякуючы гэтаму мы ўжо маем дасягненьні. Вучнёўская брыгада працуе ля мэханізаваных машын, маецца разьмеркаваньне працы і г. д. У працягу ўсёй вучобы вучні праходзяць усе процэсы вытворчасьці. Такім чынам, падрыхтоўваюцца кваліфікаваныя рабочыя

Цяпер вучнёўская брыгада дзякуючы разгортваньню соц. спаборніцтва і ўдарніцтва ідзе ўперадзе нават у параўнаньні з іншымі цэхамі. Мы вядзем пасьпяховую барацьбу супроць прагулаў.

Трэба падкрэсьліць, што моладзь арцелі яшчэ слабы ўдзел прымае ў грамадзкай рабоце. У вучнёўскай брыгадзе маюцца і такія, якія ненормальна наведваюць вучобу. Наша галоўная задача—выжыць гэтыя недахопы.

Ашаровіч.

Вытворчая маладзёжная комуна арцелі „Мэтр-Інструмант“ ім. газэты „Чырвоная Зьмена“

„Чырвоназьменаўцы“ ўперадзе

У студзені 1931 году ў арцелі „Мэтар-Інструмант“ організавалася вытворчая камуна імя „Чырвонай Зьмены“

Адразу-ж пасьля організацыі ўсе комунары законтрактавалі сябе да канца пяцігодкі і абавязаліся разгарнуць самую бязьлітасную барацьбу з усімі тымі, хто перашкаджае выконваць прамфінплян. Большасьць камунараў прымаюць актыўны ўдзел у грамадзкім, а таксама гаспадарчым жыцьці арцелі.

Акрамя таго, яны ўзялі на сябе конкрэтныя абавязкі:

— Дамагацца выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, ня гледзячы ні на якія прычыны.

— Не дапускаць ніводнага прагулу і спазьненьня, змагацца за працоўную дысцыпліну.

— Давесьці да мінімуму колькасьць браку і выпускаць добраякасную продукцыю.

— Намечаныя пункты „Чырвоназьменаўцы“ ўзяліся выконваць з гонарам і з гонарам іх выканаюць.

Бацьвіньнік.



Маладзёжная брыгада лыжнікаў арцелі ім. 16-га МЮД'а, выяжджала ў раёны па падрыхтоўцы да першай конфэрэнцыі маладых ударнікаў Менрайпрамсаюзу.

VI Усесаюзны Зьезд Саветаў

„У трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі мы завяршым пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі ў нашай краіне“

Даклад тав. МОЛАТАВА

5-ы зьезд саветаў адбываўся ў той час, калі мы яшчэ ня мелі рашаючай перавагі соцыялістычных элемэнтаў у нашай гаспадарцы. Кулак, у той час аказваючы мацнейшае супраціўленьне, імкнуўся нават пераходзіць у контрнаступленьне. Нават унутры партыі правыя опортуністыя вялі атаку супроць генэральнай лініі партыі, тармозячы соцыялістычнае наступленьне.

К VI зьезду саветаў мы дабіліся павароту бядняцка-серадняцкіх мас вёскі да соцыялізму. Бурны рост соцыялістычнай прамысловасьці, дасягнутая абсолютная перавага соцыялістычных элемэнтаў усяе нашай гаспадаркі гавораць аб тым, што перамога соцыялізму ў нашай краіне з пункту гледжаньня ўнутраных адносін клясавых сіл поўнасьцю забясьпечана.

У трэцім. рашаючым годзе пяцігодкі мы завяршым пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі ў нашай краіне.

Бачучы наш хуткі рост, буржуазія больш, чым калі-небудзь рыхтуе інтэрвэнцыю супроць СССР.

Яны пралічыліся

Мы павінны быць у любую хвіліну гатовы да адпору. У той-жа час, як мы пасьпяхова будуем соцыялізм, капіталістычныя краіны перажываюць нябывалы экономічны крызіс. Нячуванае беспрацоўе сярод прамысловых рабочых, выключнае пагаршэньне становішча шырокіх працоўных мас, масавае аб'яднаньне шырокіх пластоў сялянства—ўсё гэта выклікае глыбокія абвастрэньні.

Капіталістыя ставілі стаўку на тое, што НЭП прывядзе да буржуазнага перараджэньня Савецкага Саюзу. Яны пралічыліся! НЭП зьяўляўся ў свой час своеасаблівым мэтодам гаспадарчага будаўніцтва, які нам дазволіў на вядомай стадыі перайсьці ў рашучае наступленьне на капіталістычны сэктар. Іменна восеньню 1929 г., калі пачынаецца рашучае наступленьне на кулацтва, —за межамі разгортваецца ўзмоцненая антысавецкая кампанія: „крыжовы паход“, барацьба супроць савецкага „дэмпінгу“ і, нарэшце, кампанія супроць так званай „прымусовай працы“.

Усё гэта прасьледуе адну мэту—падрыхтаваць грамадзкую думку для інтэрвэнцыі супроць СССР.

Тав. Молатаў з лічбамі ў руках даводзіць, што наш экспорт куды ніжэй даваеннага экспорту царскай Расіі. Аднак, супроць экспорту царскай Расіі ніхто не протэставаў; калі кампанія „дэмпінгу“ стала праваліваццэ, патрабавалася новая хлусьня аб „прымусовай“ працы. Параўнаньне фактычнага становішча працы ў СССР і ў капіталістычных краінах выкрывае і гэтую хлусьню. У СССР беспрацоўе поўнасьцю ліквідавана, у той час, як у капіталістычных краінах яно перавышае 33 мільёнаў чал. У шмат краінах рабочы дзень перавышае 10 гадз., ў той час, як СССР ужо перайшоў на 7-гадзіны рабочы дзень, а у некаторых—галінах на 6 гадзінны. У соц. спаборніцтве у нас зараз удзельнічае амаль палова рабочых. Такі працоўны энтузіязм магчымы толькі таму, што наш СССР знаходзіцца ў руках рабочае клясы.

Т. Молатаў выкрывае хлусьню буржуазнага друку адносна працы зьняволеных у Савецкім Саюзе Гэтая праца ня мае ніякіх адносін да лесазагатовак і вытворчасьці якіх-небудзь экспортных тавараў.

— Мы згодны,—гаворыць тав. Молатаў,—каб любыя дэлегацыі рабочых, выбраныя самімі рабочымі прыехалі к нам у СССР пераканацца ў становішчы працы ў Савецкім Саюзе, але мы заодно патрабуем, каб на пачатках раўнапраўя і нашым рабочым было прадастаўлена права паслаць у капіталістычныя краіны такія-ж дэлегацыі.

Савецкі Саюз—краіна аплоту сусьветнага соцыялізму

Пасьля гэтага тав. Молатаў дае падрабязны агляд аб узаемаадносінах СССР з іншымі краінамі. Посьпехі індустрыялізацыі і рост абароназдольнасьці робіць Савецкі Саюз магутным фактарам міжнароднай політыкі. З кожным днём расьце міжнароднае значэньне Савецкага Саюзу, як краіны вольнай працы, як сапраўднага аплоту рабочай клясы ўсяго сьвету.

Тав. Молатаў заканчвае наступнымі словамі:


— Мы адкрыта гаворым працоўным Савецкага Саюзу і рабочым. усіх краін аб нарастаючай небясьпецы для справы міра. Мы разам з гэтым выказваем непахісную ўпэўненасьць у тым, што ўзброены напад на СССР азначае галоўную небясьпеку для тых, хто пасьмее парушыць мір і напасьці на Савецкі Саюз.

Прамова тав. Молатава, прасякнута фактычнымі прыкладамі, неаднокраць перарывалася бурнымі воплескамі ўсяе залі.

ПРЫ ПОУНАЙ БАЯВОЙ

Комсамольская комуна „Маладая Гвардыя“, колгасы „Комбайн“ і Н-скага палка напагатове, чакаюць сыгналу другой бальшавіцкай

Новым колгасным прылівам, 100-процантным выкананьнем плянаў вясеньняй сяўбы і ліквідацыяй на базе суцэльнай колектывізацыяй кулацтва як клясы, адкажам соцыял-інтэрвэнтам



РАЎНЯЙЦЕСЯ ПА КОМУНЕ „МАЛАДАЯ ГВАРДЫЯ“

Рагачэўская комсамольская організацыя з 28 лютага па 10 сакавіка 1931 году абвясьціла дэкаднік штурму за Сталінскі колгасны прыліў і падрыхтоўку да сяўбы.

Для правядзеньня гэтага дэкадніку, райком камсамолу організаваў 6 штурмавых брыгад і накіраваў іх у самыя адсталыя вёскі раёну.

Далёка няпоўныя весткі аб рабоце брыгад гавораць аб тым, што ў гэтай рабоце комсамольская організацыя дабілася вялікіх посьпехаў. Так, адна брыгада організавала тры колгасы і і тры ініцыятыўных груп.

Па лініі РА пасланы ў колгасы раёну дзьве брыгады кавалёў і плотнікаў па рамонту сельскагаспадарчага інвэнтару. 5 комсамольцаў высунуты на адказныя кіруючыя працы ў колгасах.

Комсамольская комуна „Маладая Гвардыя“ вынесла пастанову, каб кожны сябра комуны завербаваў ня менш трох аднаасобных гаспадарак у колгас.

Комуна ўзяла шэфства над унноў організаваным колгасам і паслала туды свае брыгады, якія дапамаглі-б колгасу падрыхтавацца да сяўбы.

Сама комуна „Маладая Гвардыя“ ва ўсеўзброеньні гатова сустрэць сяўбу—машыны адрамантаваны, насенныя і страхавыя фонды поўнасьцю засыпаны і ачышчаны.

Т. Цалко

На дапамогу вёскі

Рабочыя шклозаводу „Труды“ (Полацкі раён) усе, як адзін апраявалі па аднаму ў карысьць правядзеньня другой бальшавіцкай вясны.

Для дапамогі ў правядзеньні падрыхтоўчай работы ў колгасах Малаштоянскага, Арнейскага і Васілеўскага сельсаветаў рабочыя заводу накіравалі брыгаду з 35 асоб.

Трое рабочых пасланы на работу ў падшэфныя колгасы, у якіх яны прабудуць да канца пасеўкампаніі. Апрача з гэтым рабочыя заводу організавалі тры майстэрні, якія накіраваны ў колгасы памянёных сельсаветаў на два тыдні.

Разам з гэтым рабочыя шклозаводу „Труды“ купілі трактарныя акцыі на суму 800 рублёў, якія будуць перададзены таму колгасу, які лепш правядзе вясеньнюю пасеўкампанію, які будзе мець найбольшы колгасны прыліў.

Канончык.

Растуць колёны арміі колгасьнікаў

Койданава, 9 (па тэлефону). Койданаўскі райком комсамолу для пасіленьня тэмпаў падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы накіраваў брыгады комсамольцаў у ліку 25 чал. Па ўсіх ячэйках раёну створаны ўдарныя брыгады па організацыі сталінскага заклiку ў колгасы.

Ячэйкамі ўжо організавана 10 ініцыятыўных, брыгад вярбоўшчыкаў у колгасы з колгасьнікаў, беднякоў і серадняков-аднаасобнікаў.

У зьвязку з узьняцьцем масавай працы за апошнія два тыдні колектывізацыя раёну ўзьнялася на 4-5 проц. Раён колектывізаваны на 9-III на 34,5 проц.

Байдацкі і Нарэйкаўскі сельсаветы заканчваюць у асноўным суцэльную колектывізацыю. Рубілкаўскі сельсавет колектывізаваны на 60 проц.

Райком комсамолу выпрацаваў конкрэтныя мерапрыемствы работы комсамольскай організацыі па пытаньню ўдзелу комсамолу ў організацыі працы і разгортваньні соц.-спаборніцтва ў колгасах. Для рэалізацыі гэтых мерапрыемстваў па сельсаветах распачаты конфэрэнцыі колгаснай моладзі.

Вялікую працу ў справе колектывізацыі праводзіць МТС. Усе працаўнікі МТС накіраваны ў колгасы і вёскі, для правядзеньня там працы па організацыі прыліву ў колгасы. Дагаворная кампанія паміж МТС і колгасамі падыходзіць да канца. З 71 колгасу, 63 колгасы ўжо заключылі ўмовы.

МТС у поўнай гатоўнасьці чакае выезду ў поле. Усе трактары адрамантаваны.

Па ўдарнаму праходзіць праца па падрыхтоўцы кадраў трактарыстых. На організаваных трохмесячных курсах займаецца 180 чалавек, з іх 50 проц. комсамольцаў. Курсы працягнуць сваю працу да пачатку вясеньняй сяўбы. За лік скончыўшых курсы, МТС будзе цалкам забясьпечана кадрамі.

У адказ інтэрвэнтам мобілізуемся да канца правядзеньня пасеўкампаніі

Агульна-гарадзкі сход комсамольскай організацыі гораду Слуцку, які адбыўся 5-га сакавіка па пытаньню аб процэсе над „саюзным бюро“ ганьбіць здраднікоў контррэволюцыянэраў-меншавікоў, якія імкнуліся ніз-рынуць дыктатуру пролетарыяту.

Сход вітае АДПУ і яе кіраўніка тав. Мяжынскага.

У адказ контррэволюцыянэрам і шкоднікам Громанам, Шэрам і Гінзбургам, якія імкнуліся ўтварыць абшарніцка-буржуазны лад у Савецкім Саюзе, комсамольская організацыя гораду Слуцку абвясьціла сябе мобілізаванай да канца правядзеньня падрыхтоўкі і скончэньня вясеньняй сяўбы.

На гэтым-жа сходзе гарадзкая комсамолія прыняла абавязацельства распаўсюдзіць на 960 руб. трактарных акцый; паслаць дадаткова ў вёску 25 комсамольцаў для правядзеньня вясеньняй сяўбы і колектывізацыі; накіраваць 10 комсамольцаў на трактарныя курсы і 10—на сталую працу ў колгасы.

Сход аднагалосна прыняў пастанову аб правядзеньні раённага суботніка ў карысьць беспрацоўных капіталістычных краін.

Брыгада „Чырв. Зьм.“.



Прыём ваяў у колгас імя «14 Кастрычніка“ (ЦЧО)

ПАМНОЖЫЦЬ ПРЫКЛАД „КОМБАЙНА“

СЛУЦАК.—9. (Брыгада „Чыр. Зьмены“). Колгас „Комбайн“ Старынькаўскага сельсавету, Слуцкага раёну па ўдарнаму правёў падрыхтоўку да другой бальшавіцкай. Увесь сельска-гаспадарчы інвэнтар поўнасьцю адрамантаваны. Скончана ачыстка і ссыпка насенных і страхавых фондаў. Створан непарушны фуражны фонд.

Сваю падрыхтоўку да вясны колгас цесна ўвязвае з выкананьнем рашэньняў раённага зьезду саветаў аб тым, каб кожны колгас да вясны падвоіў колькасьць сваіх гаспадарак. За апошні час у „Комбайн“ уступілі 32 гаспадаркі, якія на заўтрашні дзень пасьля ўступленьня разам з старымі колгасьнікамі выехалі на вываэку лесу.

Сход колгасьнікаў разам з аднаасобнікамі навколічных вёсак, абгаварыўшы тэзісы дакладу тав. Якаўлева, якія будуць стаяць на ўсесаюзным зьезьдзе саветаў, поўнасьцю згадзіўся з імі і прыняў адозву да 6-га ўсесаюзнага зьезду саветаў, у якой гаворыцца:

„Агульны сход членаў колгасу „Комбайн“ разам з навакольнымі аднаасобнікамі беднякамі і серадняками, заслухаўшы і абмеркаваўшы тэзісы тав. Якаўлева, далучаецца да іх цалкам і поўнасьцю.

Сход запэўнівае ЦК УсеКП(б) і 6-ты ўсесаюзны зьезд саветаў, што колгас „Комбайн“ на аснове дасягнутых посьпехаў вырашыць пытаньне суцэльнай колектывізацыі сваёй вёскі Клямчаны ўвесну гэтага году“.

Застрэльшчыкі колектывізацыі

Колгас №-скай стралковай дывізіі па ўдарнаму падрыхтаваўся да другой бальшавіцкай: закончана стварэньне і ачыстка насенных фандаў, заканчваецца рамонт інвэнтару.

Сваю ўдарную падрыхтоўку да вясны колгас увязаў з організацыяй новага магутнага прыліву. Так, за апошні час у колгас уступіла амаль уся вёска Старыя Курганы, Уладзімерскага сельсавету, у колькасьці 80 двароў.

Пост „Ч. З.“—Стальны.

Кіраўніцтва, якое абанкруцілася

Каніцкі сельсавет (Касьцюковіцкі раён) ня кіруе колгасным будаўніцтвам і падрыхтоўкай да вясеньняй пасеўкампаніі.

Плян вясеньняй пасеўкампаніі не даведзен да большасьці вёсак і ў парадку ўзяцьця самаабавязацельстваў да бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Ня дадзена цьвёрдага заданьня пасеву кулацка-заможным гаспадаркам.

Ачыстка насеньня праведзена толькі на 30 проц., страхавыя і іншыя фонды ня ўтвораны. Адозва ЦК і Саўнаркому аб контрактацыі правога пасеву не популярызавана сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Організацыяй новага колгаснага прыліву сельсавет не займаецца. За час падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўкампаніі ніводная бядняцка-серадняцкая гаспадарка ня ўступіла ў колгас. Не праводзіцца працы з беднатой і батрацтвам, утвораныя пры сельсавеце групы бедноты з-за адсутнічаньня кіраўніцтва не працуюць.

На тэрыторыі сельсавету яшчэ ў мінулую восень організаваны колгас у ліку 30 гаспадарак. Гэты колгас яшчэ і сёньня не аформлен. У колгасе не абагул на працоўная жывёла, сельскагаспадарчы інвэнтар і іншыя сродкі вытворчасьці. Колгас ня рыхтуецца да вясеньняй пасеўкампаніі. Ня ўтвораны насенныя і страхавыя фонды, няма вытворчага пляну, праца не організавана.

Ня рыхтуецца да вясеньняй пасеўкампаніі і сьвінаводчы саўгас (былая фэрма профшколы). У саўгасе безгаспадарчасьць. Каровы і сьвіньні стаяць у брудзе, за апошні час пала 7 кароў. Саўгас не забясьпечаны кармам. Ня ўжыта ніякіх захадаў, каб у вясеньнюю пасеўкампанію забясьпечыць пашырэньне плошчы пад кармавымі культурамі.

Для разгортваньня ударнай працы па колектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі ў сельсавеце маюцца ўсе магчымасьці, есьць колгас, саўгас, партыйныя ячэйкі, дзьве комсамольскіх ячэйкі, сельска-гаспадарчая профшкола, у якой больш 3-х чалавек аграномаў.

Чаму-ж мы маем нездавальняючае становішча па колектывізацыі сельсавету і падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі? Гэта адбылося ў выніку таго, што сельсавет не павярнуўся тварам да колгаснага будаўніцтва, ня кіруе падрыхтоўкай да сяўбы. А партыйна-комсамольскія ячэйкі ня сталі на чале колгаснага руху, ня вядуць масавай організаванай працы з батрацтвам і беднатой, не вядуць рашучай барацьбы з кулаком. Партыйна-комсамольскія ячэйкі не мобілізавалі ўвагу вясковай грамадзкасьці і культурныя сілы вёскі для актыўнага ўдзелу ў колектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы.

Як можна расцэньваць працу сельсавету партыйных і комсамольскіх ячэек, як можна ацэньваць той факт, што па сельсавету не спагнана з кулакоў на 1-га сакавіка розных збораў больш, чым на 1500 руб. ня выкананы пляны ільназагатовак, лесазагатоўкі не распаўсюджана пазыкі „пяцігодка ў чатыры гады“? Інакш, як махровай опортуністычнай практыкай, —гэта нельга назваць.

Ставіцца пытаньне, ці зможа ў далейшым кіраўніцтва Каніцкага сельсавету, партыйнай і комсамольскіх ячэяк забясьпечыць выкананьне важнейшых дырэктыў партыі,—мець да восені гэтага гаду ня менш 45 проц. колектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і дабіцца бальшавіцкага правядзеньня вясеньняй пасеў-кампаніі. Не ня зможа

Гэта кіраўніцтва сваёй опортуністычнай дзейнасьцю дапамагала кулаку не організавала батрацтва, беднату і серадняцтва на барацьбу з кулаком, не ўмацавала адзіны ў сельсавеце колгас, не стала на чале новага магутнага прыліву ў колгасы, сарвала выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі на вёсцы.

Адсюль вывад: трэба зараз-жа зьняць з працы опортуністычнае кіраўніцтва сельсавету, партыйнай і комсамольскіх ячэек трэба неадкладна мобілізаваць масы партыйцаў і комсамольцаў на рашучае наступленьне на кулацка-заможныя элемэнты вёскі, шырока разгарнуць масавую політвыхаваўчую працу з беднатой і батрацтвам, растлумачыць ім важнейшыя мерапрыемствы партыі і ўраду, якія накіроўваюцца для пасьпяховай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і ўзьняцьця яе таварнасьці; стаць на чале ўзьняцьця новага колгаснага руху узяць ударныя тэмпы ў працы па падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі.

Выканаць гэтыя задачы зможа толькі клясава-вытрыманае кіраўніцтва.

Забясьпечыўшы комсамольскія ячэйкі бальшавіцка-вытрыманым кіраўніцтвам райком комсамолу павінен павесьці ячэйкі ў рашучы бой супроць кулацка- заможных элемэнтаў вёскі, дзеля разгортваньня ўдарных тэмпаў па суцэльнай колектывізацыі вёскі і ліквідацыі кулацтва як клясы. Форсіраваць тэмпы разьвіцьця высока-таварных галін сельскай гаспадаркі за лік нізкатаварных. Высока-таварнымі і вядучымі галінамі сельскай гаспадаркі ва ўмовах Каніцкага сельсавету павінна зьявіцца жывёлагадоўля і тэхнічныя культуры.

Умацаваць існуючы колгас, забясьпечыць ударную падрыхтоўку саўгасаў і колгасаў да вясновай сяўбы, падрыхтаваць бядняцка-серадняцкія аднаасобныя гаспадаркі да сяўбы, ўзьняць магутную хвалю колгаснага прыліву—усё гэта павінны быць важнейшымі задачамі ў рабоце комсамольскіх ячэек сельсавету.

К. Д.



Падцяжка падшыпнікаў у трактару

КОМСАМОЛ, СТРОЙСЯ У БАЯВЫЯ КОЛЕНЫ

26-га сакавіка пачынаецца паход за марксысцка-ленінскую тэорыю

Становішча політвучобы ў комсамоле

(З дакладу т. Пэрлінай на ўсебеларускай нарадзе загадчыкаў культпропамі РК КП(б)Б)

Ва ўмовах БССР комсамол мае шмат вялізарных дасягненьняў у рабоце на вытворчасьці, на сельскай гаспадарцы і іншых вучастках соцыялістычнага будаўніцтва. Але разам з дасягненьнямі ў рабоце беларускага комсамолу ёсьць шэраг недахопаў. Адным з такіх прарываў у рабоце комсамолу Беларусі неабходна констатаваць нездавальняючае разгортваньне політвучобы комсамольскай організацыі. Сёньня мы павінны сказаць, з усёй рэзкасьцю, што комсамольскія організацыі справу разгортваньня масавай політвучобы ў комсамоле незмаглі ў дастатковай ступені зьвязаць з паваротам комсамолу тварам да гаспадарчых задач.

Ахоп—33 проц.

Па нашых вестках прыблізна ў 36-38 раёнах ахоп комсамольскай моладзі рознымі формамі політвучобы складае 33 процанты. Гэта вельмі нізкі процант.

Гэта сьведчыць аб тым, што масавае разгортваньне політвучобы ў комсамоле пастаўлена нездавальняюча. Асноўнай прычынай у гэтым зьяўляецца тое, што мы недастаткова ўвязваем паварот комсамольскіх організацый да гаспадарча-політычных задач з масавым разгортваньнем політвучобы. У некаторых мясцох мы маем факты, калі пасобныя тавярышы проста недаацэньваюць значэньня політвучобы комсамолу. У гэтых адносінах характэрны Гомельская, Віцебская і Менская організацыі. У Гомелі ахоплена політвучобай 1200 комсамольцаў, у Віцебскай 200 комсамольцаў, у Менскай—ня больш 20 процантаў складу ўсяе організацыі.

Пытаньне ўвязкі політвучобы ў комсамоле з ўдзелам у гаспадарча-культурным будаўніцтве зьяўляецца асноўным, бо політвучоба ў нас не зьяўляецца самамэтай, а сродкам для палепшаньня ўцягненьня комсамольскіх організацый ў процэс соцыялістычнага будаўніцтва. Нам сёньня неабходна констатаваць, што распрацоўка рэволюцыйнай тэорыі Маркса і Леніна, у комсамольскіх організацыях пастаўлена надзвычайна слаба.

Шэраг райкомаў опортністычна адносяцца да політвучобы

Неабходна адзначыць, што ў шэрагу раёнаў мы маем зрыў падрыхтоўкі да навучальнага году. У Полацку, Рагачове, Барысаве і іншых мясцох райкомы комсамолу недаацанілі важнасьці разгортваньня політвучобы, мала займаліся пытаньнямі політвучобы комсамольскіх організацый, ня гледзячы на тое, што бюро ЦК ЛКСМБ вынесла спецыяльнае рашэньне аб разгортваньні політвучобы.

Цэнтральны камітэт комсамолу Беларусі на сакратарыяце заслухоўваючы пытаньне аб становішчы політвучобы, адзначыў, што з боку шэрагу райкомаў мы маем опортуністычную недаацэнку значэньня політвучобы, што шэраг райкомаў ня здолелі стаць на чале кіраўніцтва гэтай справы. Да гэтага трэба дадаць, што і ЦК ЛКСМБ, выдаўшы гэтую пастанову аб разгортваньні масавай політвучобы ў комсамольскіх організацыях, не праверыў выкананьне яе.

Мала фіксаваць дрэннае становішча разгортваньня політвучобы, трэба прыняць адпаведныя меры да тых, хто зрывае політвучобу, выяўляе опортуністычныя адносіны да яе.



За вывучэньнем рашэньняў зьездаў ЛКСМ

Мы слаба рыхтуем комсамольскі актыў

Трэба спыніцца на працы курсаў комсамольскага актыву, якія існуюць у нас пры камвузе. На гэтых курсах у гэтым годзе толькі 50 слухачоў, ня гледзячы на тое, што ў мінулым годзе было 70-100 чалавек. Як бачым ва ўкомплектаваньні курсаў у нас атрымаўся прарыў. Прарыў гэты атрымаўся з тае прычыны, што нашы райкомы ў шэрагу месц недаацанілі важнасьці пытаньня падрыхтоўкі комсамольскага актыву. У гэтым павінен і Цэнтральны Камітэт комсамолу, які недастаткова кіраваў пытаньнем падрыхтоўкі комсамольскага актыву, спадзяючыся толькі на райкомы комсамолу, ЦК ЛКСМБ ня ўсё зрабіў для таго, каб мы забясьпечылі пашырэньне курсаў.

У цэлым шэрагу раённых організацый праведзены двухтыднёвыя і 10-дзённыя курсы па падрыхтоўцы комсамольскага актыву, але ўсё гэта не забясьпечвае тых узрастаючых задач, якія стаяць перад падрыхтоўкай нашага комсамольскага актыву. Усё гэта павінна надалей зьвяцца вуркам у справе падрыхтоўкі кадраў прапагандыстаў, з рабочых, колгасьнікаў, забясьпечыць гэтым клясава-вытрыманую вучобу.

Мэтодычнае кіраўніцтва адсутнічае

У сыстэме тэорэтычнага навучаньня комсамольскай організацыі адсутнічае мэтодычнае кіраўніцтва. Трэба сказаць, што ў гэтым вінаваты партыйныя габінэты, якія маюцца ў нас у шмат якіх раёнах, і Менскі Дом Комасьветы. Гэтыя ўстановы павінны кіраваць тэорэтычнай вучобай, даваць мэтодычную дапамогу ў справе разгортваньня, як сеткі комсамольскай політвучобы, так і самых яго мэтодаў. Вінаваты таксама і культурнікі-прапагандысты, якія не трымаюць сувязі з партыйнымі габінэтамі, не зьвярталіся за належнай дапамогай.

Формы політвучобы

У галіне стварэньня форм комсамольскага політнавучаньня, перад намі стаіць вялізарная задача. Нам неабходна ўвязаць з асноўнымі формамі політвучобы ў шэрагах комсамолу. Такімі асноўнымі формамі зьяўляюцца: школа навічкоў, якая разьлічваецца на нашых новых комсамольцаў, на рабочы маладняк, якому мы павінны на працягу трох месяцаў даць элемантарныя веды і прадстаўленьне аб комсамоле, аб асноўных задачах партыі ў рэконструкцыйны пэрыод. Гэтая школа бязумоўна забясьпечвае шырокі ахоп беспартыйнай моладзі. Другой формай політвучаньня выяўляюцца гурткі бягучай політыкі. Гэтыя гурткі выяўляюцца найбольш рухомай формай, у якой комсамольцы могуць атрымаць адказы на бягучыя пытаньні політыкі партыі і комсамолу. Акрамя гэтых двух форм вельмі шырока трэба разгортваць сетку політвытворчых школ. Політвытворчая школа ў сваёй практыцы забясьпечвае сталую прапрацоўку політычных прадметаў, непасрэдную практычную і глыбокую ўвязку дысцыпліны, якія прапрацоўваюцца, з работай на вытворчасьці. Сетка політыка-вытворчых школ у нас зараз пачынае разгортацца. Пры разгортваньні ўсёй сыстэмы політасьветы ў шэрагах комсамолу, політыка—вытворчыя школы трэба популярызаваць. Вышэйшай формай вучобы актыву зьяўляюцца тэматычныя гурткі. У гэтых гуртках актывістыя змогуць стала распрацоўваць па асобных прадметах і тэмы.

У вёсцы асноўнай сеткай політвучобы мы маем тую-ж самую, што і ў гарадзе школы навічкоў, політыка-колгасныя школы, гурткі бягучай політыкі. Гэтыя формы політвучобы ў вёсцы зьяўляюцца самымі гнуткімі, яны забясьпечваюць сталую прапрацоўку бягучых пытаньняў.

Даць добры падручнік

Хворым зьявішчам у разгортваньні комсамольскай політвучобы зьяўляецца пытаньне аб падручніку. Пытаньне аб падручніках у нас пастаўлена зусім дрэнна. У нас ёсьць шмат комсамольскіх часопісаў але яны ў сваёй большасьці ня выпісваюцца комсамольскімі організацыямі. Добрыя падручнікі нашым Дзяржвыдавецтвам не перакладаюцца на беларускую мову. У гэтым мы фактычна і робім правал на беларусізацыі, поўнасьцю ня выконваем рашэньні Кастрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б па беларусізацыі.

У рабоце па разгортваньні комсамольскай політвучобы не праявілі належнага кіраўніцтва партыйныя органы, пачынаючы ад культпропу ЦК і канчаючы партыкамітэтамі. Надалей гэткія зьявішча безадкладна трэба зьнішчыць.

У іх варта вучыцца

Політшкола Калінкавіцкай школы комуны працуе добра. У школу ўцягнуты ўсе комсамольцы і 50 беспартыйных вучняў школы. Апрача політшколы комсамольскай ячэйкай організаваны два політгурткі па распрацоўцы пастаноў зьездаў. Беспартыйныя вучні комуны праяўляюць вялікую зацікаўленасьць да прапрацоўкі політпытаньняў. Заняткі праходзяць пры вельмі актыўным удзеле ўсіх прысутных. У выніку цэлы рад беспартыйных вучняў школы—комуны падалі заяву аб ўступленьні ў комсамол.

Н.

У ПАХОД ЗА РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ТЭОРЫЮ

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ

Забесьпячэньне яшчэ большага ўдзелу комсамольскай організацыі ў соцыялістычным будаўніцтве патрабуе прыняцьця шэрагу мерапрыемстваў па палепшаньню становішча комсамольскай політвучобы, па аўладаньню марксысцка-ленінскай тэорыяй, асабліва па ліквідацыі няпісьменнасьці ў вайсковых комсамольскіх організацыях.

Выходзячы з гэтага бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Адобрыць прапанову менскіх колектываў і Гаркому аб праведзеньні паходу за вывучэньне рэволюцыйнай тэорыі і абвясьціць па ўсёй Беларусі з 26 сакавіка ўсебеларускі паход за вывучэньне марксысцка-ленінскай тэорыі.

2. Для падрыхтоўкі да паходу і праверкі становішча політвучобы абвясьціць ц-каднік з 15 сакавіка,

3. Скласьці штаб для распрацоўкі мерапрыемстваў па паходу і кіраўніцтву ў складзе таварышоў: Пэрлінай (старшыня), Яцкевіча (прадстаўніка Інстытуту Гісторыі партыі), Комвузу, і Дому Комасьветы.

4. Штабу па паходу даручыць распрацоўку пляну паходу і мэтодычных матар'ялаў з тым, каб апошнія былі падрыхтаваны ў 5-дзённы тэрмін.

5. Ва ўсіх раёнах на працягу першай паловы сакавіка правесьці раённыя конфэрэнцыі па політадукацыі пад лёзунгам: організацыі паходу, якаснага палепшаньня політвучобы. Аддзелу тэорыі і прапаганды аб гэтым даць дадатковыя паказаньні.

6. Прапанаваць РК цалкам выканаць дадзеную разьвёрстку ЦК па распаўсюджваньню 6-томніка твораў Леніна.

7. Абавязаць раённыя камітэты пакласьці ў аснову паходу вывучэньне Ленінскага 6-томніка і рашэньні зьездаў партыі.

Уся існуючая сетка політвучобы застаецца цалкам. Паход праводзіцца пад лёзунгам: „кожны цэх, кожны колгас і саўгас—ёсьць ленінскі унівэрсытэт“.

8. Ва ўсіх раёнах стварыць сэмінары, каротка-тэрміновыя курсы па падрыхтоўцы рабочых-прапагандыстых.

9. У мэтах лепшага правядзеньня паходу—шырока скарыстоўваць організацыю промполітбаёў і соц. спаборніцтва паміж ячэйкамі і раёнамі.

10. „Чырвонай Зьмене“ і „Юнгэр Арбэйтэр“ на сваіх старонках забясьпечыць асьвятленьне паходу за рэволюцыйную тэорыю.

Бэрлінскія работніцы даюць абяцаньне змагацца да канчатковай перамогі нямецкага пролетарыяту

БЭРЛІН, 18. Міжнародны жаночы дзень у Бэрліне быў адзначан масавым мітынгам, на якім прысутнічалі тысячы рабочых. Мітынг прайшоў з вялізарным уздымам. Выступіўшы на ім прадстаўнік нямецкай компартыі тав. Ульбрыхт спыніўся на барацьбе супроць фашызму і супроць усё ўзмацнюючагася наступленьня прадпрыемцаў на зарплату, выкрываў соцыял-фашысцкіх лідэраў і рэформісцкіх профбюрократаў, падтрымліваючых гэта наступленьне капіталістых і гнусна прадаючых інтарэсы, як усяе рабочае клясы, так і ў прыватнасьці, работніц.

Выступіўшая затым комдэпутатка рэйхстагу т. Овердах заклікала ўсіх жанчын-работніц удзельнічаць у агульнай барацьбе рабочае клясы. Спатканы выкрыкамі „рот фронт“ вядомы пролетарскі пісьменьнік урач Фрыдрых Вольф, у свой час арыштаваны па абвінавачваньню ў парушэньні 218 арт. крымінальнага кодэксу, выступіў з протэстам супроць гэтага артыкулу.

Адна з прысутных на мітынгу работніца выказала, пры незмаўкаемых выкрыках ухвалы ўсяго сходу, Фрыдрыху Вольфу удзячнасьць ад ўсіх жанчын-работніц за яго мужнае выступленьне супроць законаў буржуазіі.

У заключэньне сход аднагалосна прыняў рэзолюцыю, у якой бэрлінскія работніцы даюць абяцаньне змагацца да канчатковай перамогі нямецкага пролетарыяту супроць фашызму, за поўнае жаночае раўнапраўе, за забесьпячэньне работай і хлебам і за свабоду. Далей у рэзолюцыі гаворыцца: „Жанчыны-работніцы абураны контррэволюцыйнай дзейнасьцю другога Інтэрнацыяналу і ў асаблівасьці нямецкай с.-д. партыяй, якія падрыхтоўвалі ніспрынуцьцё савецкай улады з дапамогай рускіх меншавікоў. Мы заяўляем усім ворагам Савецкага Саюзу, што на абарону—на абарону бацькаўшчыны ўсіх жанчын-работніц,—выступяць мільёны жанчын-работніц і за яго аддадуць сваё жыцьцё“.

На мітынгу многа работніц заявіла аб уступленьні ў рэволюцыйны саюз барацьбы супроць фашызму, а таксама і ў нямецкую компартыю. Пасьля мітынгу на вуліцах, ня гледзячы на прынятыя паліцыяй меры, аўбыліся бурныя дэмонстрацыі пад лёзунгам: „далоў урад голаду Брунінга! Няхай жыве савецкая ўлада!“

Паведамленьне

Менгарбюро ДКО 11 красавіка ў 7 гадзіне ўвечары ў Доме Комсамолу (Комсамольская вул.) склікае нараду правадыроў баз і атрадаў.

Яўка правадыроў абавязкова.

Адказны рэдактар—МІХ. ПЛАТАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599